# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ І КАНТРОЛЬНЫЯ РАБОТЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Віцебск 2002

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава

**Р.Ул. Цімафееў**

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ І КАНТРОЛЬНЫЯ РАБОТЫ ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

***Для студэнтаў АЗН негістарычных спецыяльнасцей універсітэта***

*Віцебск*
*Выдавецтва Віцебскага дзяржуніверсітэта імя П.М. Машэрава*
*2002*

УДК 947.6
ББК 63.3(4 Бен)
Ц 61

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава

*Аўтар*: кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава ***Р.У. Цімафееў***

*Рэцэнзент*: кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М. Машэрава ***В.У. Акуневіч***

***Р.Ул. Цімафееў***
Ц 61 **Метадычныя рэкамендацыі і кантрольныя работы па гісторыі Беларусі.** Для студэнтаў АЗН негістарычных спецыяльнасцей універсітэта. – Віцебск: Выдавецтва Віцебскага дзяржуніверсітэ-та імя П.М. Машэрава, 2002. – 65 с.

Метадычныя рэкамендацыі і кантрольныя работы па гісторыі Беларусі складзены ў адпаведнасці з праграмай «Гісторыя Беларусі», зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 24 студзеня 2000 г. Рэгістрацыйны нумар ТД-67/тып.

У вучэбным дапаможніку распрацаваны тэмы кантрольных работ, кожная з якіх падзелена на асобныя пытанні. Студэнтам-завочнікам прапануюцца рэкамендацыі па выкананні кантрольных работ у цэлым і рэкамендацыі па асобных пытаннях кожнай тэмы. Літаратура уключае найбольш вядомыя і актуальныя выданні.

© Цімафееў Р.Ул.
© Выдавецтва ВДУ ім. П.М.Машэрава, 2002



# АГУЛЬНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА НАПІСАННІ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

Каб забяспечыць поспех у працы студэнтаў завочнай формы навучання негістарычных спецыяльнасцей неабходна дапамагчы ім арганізаваць сваю самастойную работу над вучэбным матэрыялам. Самастойная праца складаецца з шэрагу элементаў, адным з якіх з'яўляецца выкананне кантрольнай работы. Выкананне кантрольных работ развівае розум і вучыць творчаму даследчаму падыходу да канкрэтнага вучэбнага матэрыялу. Напісанне кантрольных работ дапамагае студэнтам крытычна асэнсаваць дакументальны матэрыял.

Пісьмовая работа і навучае, і кантралюе студэнта. Выкананне яе з'яўляецца залогам глыбокага засваення вучэбнага матэрыялу. Яна садзейнічае падрыхтоўцы да экзамену. Выкананне пісьмовых работ дапамагае ўстанаўленню кантакту студэнта з выкладчыкам.

Змест і афармленне выкананай работы дае выкладчыку падставу для меркавання аб падрыхтоўцы студэнтаў, аб уменні працаваць над вучэбным матэрыялам. Гэта дазваляе своечасова выпраўляць і тлумачыць студэнту зробленыя ім памылкі. Пісьмовыя работы дазваляюць зрабіць вывад аб праведзенай студэнтамі самастойнай працы на працягу вучэбнага года, аб падрыхтоўцы да здачы экзамену. Кантрольная работа – гэта форма выяўлення узроўню развіцця студэнта.

Тэмы кантрольных работ прапануюцца ў адпаведнасці з праграмай курса «Гісторыя Беларусі», зацверджанай Міністэрствам адукацыі ў якасці базавай для негістарычных спецыяльнасцей.

Пісаць кантрольныя работы неабходна на падставе той літаратуры, якая рэкамендавана да кожнай тэмы кантрольнах работ. Да выканання кантрольнай работы можна прыступаць тады, калі студэнт упэўнены, што рэкамендаваная па тэме літаратура вывучана, зроблены адпаведныя вывады, вылучаны сусветны кантэкст.

Па свайму характару выпіскі могуць быць разнастайнымі. Калі думка аўтара сфармулявана коратка і дакладна, мэтазгодна выпісаць яе даслоўна. Змест вялікіх раздзелаў працы лепш перадаць сваімі словамі. Пры афармленні выпісак ва ўсіх выпадках неабходна ўказваць прозвішча і ініцыялы аўтара працы, яе дакладную назву, часопіс, зборнік, дзе яна змешчана, выхадныя даныя (абавязкова месца выдання, год) і старонку. Калі літаратура будзе вывучана, выпіскі неабходна сістэматызаваць згодна з планам кантрольнай работы.

Перад тым, як пісаць кантрольную работу, трэба прадумаць суадносіны асобных яе пунктаў, улічваючы, што кантрольная работа па любой тэме павінна быць аб'ёмам не менш за 14 старонак. Аб'ём, які плануецца для асвятлення таго ці іншага пытання, павінен зыходзіць з агульнага аб'ёму і адпавядаць значнасці гэтага пытання.

Ва ўводзінах коратка канкрэтызуецца тэма, даецца характарыстыка літаратуры. У канцы ўводзін дакладна вызначаюцца задачы, што паставіў аўтар у кантрольнай рабоце. Далей раскрываецца змест пытанняў, адказ на кожнае з якіх – частка кантрольнай работы з назвай, што паказвае змест пытання. У кантрольных работах прапануецца пяць пытанняў, першае з якіх абявязкова датычыцца сусветнага кантэксту.

У заключэнні аўтар робіць вывады па ўсёй рабоце (кожнае пытанне, што разглядаецца ў кантрольнай рабоце, павінна мець свае вывады), разглядае сувязі даследаванага матэрыялу з наступнымі гістарычнымі падзеямі. За заключэннем ідзе спіс выкарыстанай літаратуры (бібліяграфія). Кантрольная работа павінна быць акуратна і правільна афармлена. Чыставы варыянт работы змяшчае тытульны ліст, тэкст, што напісаны ў сшытку, неабходны даведачны апарат.

Афармляючы кантрольную работу, студэнт прытрымліваецца вызначанага парадку: на тытуле ён указвае неабходныя звесткі (дадатак 1), на наступнай старонцы падае назву тэмы і план, пасля чаго выкладаецца змест, усім часткам работы ў тэксце трэба даць загалоўкі, скарачэнні слоў не дазваляюцца, старонкі нумаруюцца. Неабходна дакладна афармляць даведачны апарат і спасылкі ў тэксце работы на крыніцы і літаратуру.

Пры першым упамінанні кнігі ў тэксце ў канцы фразы ставіцца лічба 1, а ўнізе старонкі пад гэтай лічбай - прозвішча і ініцыялы аўтара, назва кнігі, месца выдання, выдавецтва, год выдання, а пры цытаванні тэксту (які абавязкова бярэцца ў двукоссе) - нумар старонкі.

Пры паўторным упамінанні крыніцы ў тэксце работы робіцца спасылка ўжо без выхадных дадзеных (месца і года выдання), але абавязкова з указаннем старонкі або старонак.

Калі дакумент ўзяты паўторна, то тады ў зносцы трэба адзначыць: цыт. па.... (указаць аўтара, назву кнігі альбо артыкула і выхадныя даныя). Зноскі (іх можа быць некалькі) трэба рабіць унізе старонкі пад рыскай.

Практыкуецца і іншая форма: спасылкі на даследаванні ў тэксце нумаруюцца (1, 2, 3), а самі зноскі пад гэтымі нумарамі выносяцца ў канец кантрольнай работы пасля заключэння.

Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры падаецца ў алфавітным парадку, з указаннем прозвішча і ініцыялаў аўтара, назвы кнігі ці артыкула (і адпаведна часопіса, зборніка), месца і года выдання. Выкананая кантрольная работа дасылаецца ва ўказаны тэрмін метадысту па завочнаму навучанню, які перадае яе на рэцэнзію выкладчыку.

Дыферэнцаваная адзнака на кантрольнай рабоце не выстаўляецца. Незалічаная кантрольная работа перадаецца студэнту для перапрацоўкі, а затым зноў рэцэнзуецца.

Студэнты-завочнікі, якія не атрымалі заліку па кантрольнай рабоце да пачатку сесіі, да здачы экзамену не дапускаюцца.



**Дадатак 1**. Узор тытульнага ліста кантрольнай работы

**ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА**

Спецыяльнасць «Біялогія і ахова прыроды»

**Біялагічны факультэт**

завочнае аддзяленне

**Кантрольная работа № ___**
**па гісторыі Беларусі**
**студэнта І курса завочнага аддзялення БФ**
**Бараноўскага Уладзіміра Яўгенавіча**

Хатні адрас:

210038, г. Віцебск,
Маскоўскі пр., д. 39, кв. 11.
Бараноўскі У.Я.

**2001/2002 навучальны год**

## 1. Першабытнаабшчыннае грамадства на тэрыторыі Беларусі ў перыяд каменнага і бронзавага вякоў

План:

1. Пытанне прарадзімы чалавецтва.
2. Станаўленне першабытнаабшчыннага ладу на тэрыторыі Беларусі.
3. Засяленне тэрыторыі нашчадкамі познепалеалітычнага насельніцтва.
4. Неалітычная рэвалюцыя.
5. Прыход і рассяленне індаеўрапейцаў. Балцкія плямёны ў бронзавым веку.

Літаратура:

Археалогія Беларусі. Т. 1. Мінск, 1997.
Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мінск, 1993.
Всемирная история в 24 томах. Т. 1. Минск, 1999.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
История Белорусской ССР. Минск, 1977.
Калечыц А. Першыя людзі на зямлі Беларусі. Мінск, 1997.
Ксензов В. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья. Минск, 1988.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Чарняўскі М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Минск, 1981.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першым пытанні неабходна паказаць з 'яўленне чалавека ў прыродзе сусвету; дзе, калі, як адбыўся і працягваўся гэты працэс.

Па другому пытанню пакажыце стан жыцця неандэртальца, пераход ад праабшчыны да роду ў краманьёнца, ўплыў ледавіка на іх становішча.

Па трэцяму пытанню акрэсліце ўплыў прыродных змен на удасканаленне гаспадаркі мезаліту, пералічыце рысы археалагічных культур.

Па чацвёртаму пытанню - вызначыць асноўныя рысы гаспадарчых і сацыяльных змен ў неаліце, пералічыць археалагічныя культуры.

Па пятаму пытанню вызначце прарадзіму і асноўныя рысы індаеўрапейцаў, іх падзел на асобныя плямёны, вытворчую гаспадарку.



## 2. Жалезны век на тэрыторыі Беларусі

План:

1 Лакалізацыя славянскай прарадзімы.
2. Уплыў выкарыстання жалеза на грамадскі лад і гаспадарку Беларусі.
3. Асноўныя археалагічныя культуры.
4. Засяленне тэрыторыі Беларусі славянскімі плямёнамі.
5. Этнічныя працэсы, абумоўленыя рассяленем славян у балцкім арэале.

Літаратура:

Археалогія Беларусі. ТТ. 2, 3. Мінск, 1999, 2000.
Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. Мінск, 1993.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 2, 3. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
Загарульскі Э. Заходняя Русь: IX - XIII ст. Мінск, 1998.
Загорульский Э. Древняя история Белоруссии. Минск, 1977.
История Белорусской ССР. Минск, 1977.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Пилипенко М. Возникновение Белоруссии. Минск. 1991.
Седов В. Происхождение и древняя история славян. Москва, 1979.
Шадыро В. Ранний железный век северной Белоруссии. Минск, 1985.
Штыхов Г., Лысенко П. Древнейшие города Белоруссии. Мінск, 1986.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню пазначце асноўныя версіі славянскай прарадзімы і падставы для існавання.

Па другому пытанню трэба паказаць пашырэнне земляробства, жывёлагадоўлі, працэс плаўкі жалеза, умацаванне суседскай абшчыны.

Па трэцяму пытанню - этнічную ідэнтыфікацыю, тэрытарыяльныя межы, час існавання і гаспадарчыя рысы археалагічных культур.

Па чацвёртаму пытанню пакажыце напрамкі, час і этапы славянскай каланізацыі беларускіх земляў.

Па пятаму пытанню вызначыце асноўныя рысы славяна-балцкага ўзаемаўплыву і галоўныя версіі фарміравання беларускага этнасу.

## 3. Усходнія славяне - асноўнае насельніцтва Беларусі ў IX – першай палове XIII ст.

План:

1. Славяне ва ўяўленнях еўрапейскіх і арабскіх гісторыкаў.
2. Аповесці аб славянскім рассяленні. Крывічы, дрыгавічы, радзімічы.
3. Грамадскі лад усходніх славян.
4. Гаспадарчыя заняткі. Вераванні.
5. Перадумовы ўзнікнення беларускага этнасу.

Літаратура:

Археалогія Беларусі. Т. 3. Мінск, 1999, 2000.
Всемирная история в 24 томах. Т. 3. Минск, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
Гринблат М. Белорусы. Минск. 1968.
Загарульскі Э. Заходняя Русь.: IX - XIII ст. Мінск, 1998.
Загорульский Э. Древняя история Белоруссии. Минск, 1977.
Лысенко П. Дреговичи. Минск, 1993.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Пилипенко М. Возникновение Белоруссии. Минск. 1991.
Поболь Л. Славянские древности Белоруссии. Минск, 1971.
Седов В. Происхождение и древняя история славян. Москва, 1979.
Седов В. Восточные славяне в 6 - 13 вв. Москва, 1982.
Штыхов Г, Лысенко П. Древнейшие города Белоруссии. Мінск, 1986.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню вызначце думкі рымскіх, арабскіх і візантыйскіх аўтараў аб славянах і месцах іх рассялення.

Па другому пытанню трэба паказаць як «Аповесць мінулых часоў» расказвае аб землях славян; межы і рысы асноўных славянскіх плямён.

Па трэцяму пытанню акрэсліце рысы вялікай патрыярхальнай сям*і славян, стан рода-племянной вярхушкі.

Па чацвёртаму пытанню неабходна паказаць як развіццё земляробства, рамяства, промыслаў, так і паганскі пантыён багоў у славян.

Па пятаму пытанню – эканамічныя і сацыяльныя падставы фарміравання беларускага этнасу, уплыў на яго першых княжанняў.



## 4. Стварэнне і пашырэнне старажытнай усходнеславянскай дзяржавы Кіеўская Русь (862–982 гг.)

План:

1. Скандынаўскі і візантыйскі ўплыў на славян.
2. Паходжанне тэрміна «Русь».
3. Канцэпцыі паходжання і шляхі ўтварэння старажытнарускай дзяржавы;
4. Узаемаадносіны паміж Кіеўскай, Наўгародскай і Полацкай землямі.
5. Сацыяльна-эканамічныя асновы першай усходнеславянскай дзяржавы.

Літаратура:

Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 6, 7. Минск, 1999, 2000.
Галубовіч В. Эканамічны стан, побыт і гандаль старажытнай Беларусі. Мінск, 1997.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Загарульскі Э. Заходняя Русь.: IX - XIII ст. Мінск, 1998.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды. Мінск, 1991, 2001.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Сыны і пасынкі Беларусі. Мінск, 1996.
Эканамічная гісторыя Беларусі. Мінск, 1999.
Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. Мінск, 1989.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню – з'яўленне на землях Кіеўскай Русі варажскіх князёў і іх дружын, палітычныя і эканамічныя сувязі з Візантыяй.

Па другому пытанню выдзеліце асноўныя версіі ўзнікнення назвы «Русь» і падставы для іх існавання.

Па трэцяму пытанню – прычыны ўзнікнення «нарманскай тэорыі», антынарманскіх поглядаў, сучасных канцэпцый дзяржаваўтварэння.

Па чацвёртаму пытанню трэба паказаць прычыны і працэс аб'яднання ўсходнеславянскіх земляў у адзіную ўсходнеславянскую дзяржаву.

Па пятаму пытанню высветліце працэс фарміравання на землях Русі новых феадальных адносін і пашырэння колаў феадальнай вярхушкі.

## 5. Станаўленне і развіццё Полацкага княства ў IX–XI стст.

План:

1. «Свяшчэнная Рымская імперыя» ў IX - XI ст.
2. Заснаванне Полацка, ўтварэнне Полацкага княства.
3. Палітычная гісторыя княства і яго адносіны з Кіевам.
4. Арганізацыя кіравання ў княстве. Знешнепалітычныя сувязі.
5. Сацыяльна-эканамічнае развіццё.

Літаратура:


Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 7., 8. Минск, 1999, 2000.
Галубовіч В. Эканамічны стан, побыт і гандаль старажытнай Беларусі. Мінск, 1997.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Загарульскі Э. Заходняя Русь: IX - XIII ст. Мінск, 1998.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Полацкі і Навагародскі перыяды. Мінск, 1991, 2001.
Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1995.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994.


Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню вызначце рысы знешняй палітыкі «Свяшчэннай Рымскай імперыі» ў IX–XI стст. і яе агрэсію супраць славянаў.

Па другому пытанню пакажыце ўдзел Полацкага княства ў заснаванні і развіцці Кіеўскай Русі, вызначце ролю скандынаўскага элемента.

Па трэцяму пытанню пакажыце ступень уплыву Кіева на Полацк, княскі радавод, умешальніцтва Полацка ў дынастычную барацьбу ў Кіеве.

Па чацвёртаму пытанню - ролю веча, баяр ў кіраванні, асабліваe становішча князя, сістэму апалчэння і метады знешняй палітыкі.

Па пятаму пытанню - развіццё земляробства, сістэму землеўладання і землекарыстання, стан рамяства і гандлю, шлях «з варагаў ў грэкі».



## 6. Тураўскае княства і землі - суседзі ў X–XI стст.

План:

1. Падзел хрысціянскага свету на заходнюю і ўсходнюю часткі.
2. Гісторыя ўтварэння Тураўскага княства. Адносіны з Кіевам
3. Тэрыторыя Тураўскага княства і суседзі: Пінск, Бярэсцье.
4. Кіраванне Тураўскім княствам і яго асаблівасці.
5 Эканамічныя сувязі.

Літаратура:


Всемирная история в 24 томах. ТТ. 7, 8. Минск, 1999, 2000.
Галубовіч В. Эканамічны стан, побыт і гандаль старажытнай Беларусі. Мінск, 1997.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Загарульскі Э. Заходняя Русь.: IX - XIII ст. Мінск, 1998.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Седов В. Восточные славяне в 6 - 13 вв. Москва, 1982.
Сыны і пасынкі Беларусі. Мінск, 1996.
Филист Г. История «преступлений» Святополка Окаянного. Минск, 1990.


Рэкамендацыі па выкананню работы:

Па першаму пытанню пакажыце знешнюю палітыку каталіцкіх дзяржаў і Візантыі ў дачыненні да суседніх усходнеславянскіх земляў.

Па другому пытанню вызначце становішча Турава як аднаго з цэнтраў дрыгавічоў і этапы пашырэння княства.

Па трэцяму пытанню - асноўныя этапы палітычнай гісторыі княства, ўплыў на барацьбу за Кіеў, узаемасувязі паўднёвых гарадоў Русі.

Па чацвёртаму пытанню адзначце ролю Турава ў дынастычнай іерархіі Кіеўскай Русі, ролю веча і прычыны з 'яўлення пасадніка.

Па пятаму пытанню - месца княства як пасрэдніка ў гандлі паміж усходнімі і заходнімі землямі Еўропы, стан рамяства і земляробства.

## 7. Удзельны перыяд заходніх земляў Русі (XII - першая пал. XIII ст.)

План:

1. Заходнія і паўднёвыя суседзі ўсходніх славян у XII – першай палове XIII ст.
2. Прычыны феадальнай раздробленасці на беларускіх землях.
3. Удзельныя княствы на тэрыторыі Беларусі.
4. Барацьба з агрэсіяй крыжакоў.
5. Мангола-татары на беларускіх землях.

Літаратура:

Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994.
Всемирная история в 24 томах. Т. 8. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Т. 1. Мінск, 1972.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
Загарульскі Э. Заходняя Русь: IX-XIII стст. Мінск, 1998.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагародскі перыяды. Мінск, 1991, 2001.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Эканамічная гісторыя Беларусі. Мінск, 1999.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню пакажыце месца і ролю славянскіх дзяржаў Еўропы ў агульнай сістэме міжнародных адносін.

Па другому пытанню вызначце палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя прычыны раздробленасці, яе рысы і вынікі.

Па трэцяму пытанню неабходна паказаць ўзаемаадносіны буйнейшых беларускіх княстваў паміж сабой і з суседзямі, тэрытарыяльныя змены.

Па чацвёртаму пытанню - вытокі крыжацкага руху, разгортванне агрэсіі ў Прыбалтыцы і супраціўленне ёй з боку Полацка, Ноўгарада і балтаў.

Па пятаму пытанню вызначце падрыхтоўку і этапы мангола-татарскай агрэсіі на славянскія землі, яе асаблівасці на беларускіх землях.



## 8. Рэлігія і культура беларускіх земляў у IX – першай пал. XIII ст.

План:

1. Паходжанне хрысціянства і яго распаўсюджванне ў Еўропе.
2. Паганства. Прынятце хрысціянства і яго распаўсюджванне на Беларусі.
3. Дзейнасць Е. Полацкай, К. Тураўскага, К. Смаляціча, А. Смаленскага.
4. Пісьменства і летапісанне. Рукапісныя кнігі.
5. Архітэктура і мастацтва.

Літаратура:

Арлоў У. Еўфрасіння Полацкая. Мінск, 1992.
Архітэктура Беларусі. Мінск, 1993.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 7, 8. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 6 тт. Т. 1. Старажытная Беларусь. Мінск, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд. Мінск, 1985.
Гісторыя беларускага мастацтва ў 6 тт. Т. 1. Мінск, 1987.
Загарульскі Э. Заходняя Русь: IX - XIII ст. Мінск, 1998.
История Белорусской ССР. Минск, 1977.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мінск, 1995.
Цітоў В. Этнаграфічная спадчына. Мінск, 1997.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню - працэс распаўсюджвання, каштоўнасці, ролю і ўплыў хрысціянскай царквы на развіццё асветы і культуры.

Па другому пытанню пазначце паганскую іерархію багоў ва ўсходніх славянаў, прычыны, метады і цяжкасці распаўсюджвання хрысціянтва.

Па трэцяму пытанню выдзеліце асноўныя этапы жыцця, вынікі дзейнасці галоўных беларускіх асветнікаў.

Па чацвёртаму пытанню трэба акрэсліць час з'яўлення, рух развіцця, помнікі пісьменства, сувязь летапісання з царквою і князямі.

Па пятаму пытанню раскрыйце асноўныя напрамкі, школы, стылі, дасягненні ў развіцці беларускага дойлідства і мастацтва.

## 9. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага (30-80-я гг. XIII ст.)

План:

1. Нашэсце мангола-татараў і агрэсія крыжакоў ва Усходняй Еўропе.
2. Паняцце «Літва», беларускія і балцкія землі напярэдадні аб'яднання.
3. Фактары аб'яднання. Асноўныя канцэпцыі ўтварэння ВКЛ.
4. Міндоўг і яго палітыка.
5. Барацьба за княжанне пасля смерці Міндоўга (1263–1282 гг.)

Літаратура:

Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994.
Беларускія летапісы і хронікі. Мінск, 1997.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 7, 8. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ермаловіч М. Беларуская дзяржава ВКЛ. Мінск, 2000.
Ермаловіч М. Па слядах аднаго міфа. Мінск, 1991.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагародскі перыяды. Мінск, 1991, 2001.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Сыны і пасынкі Беларусі. Мінск, 1996.
Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994.
Насевіч В. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. Мінск, 1993.
Чаропка В. Імя ў летапісе. Мінск, 1994.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню пакажыце падрыхтоўку, этапы і вынікі агрэсіі мангола-татараў і крыжакоў ва Усходнюю Еўропу.

Па другому пытанню - версіі па размяшчэнню тапоніма «Літва», яго этнічнай прыналежнасці, сацыяльна-палітычнае жыццё славян і балтаў.

Па трэцяму пытанню выдзеліце ролю Наваградка, беларускіх земляў і знешняй пагрозы ва ўтварэнні ВКЛ, пазначце адрозненні канцэпцый.

Па чацвёртаму пытанню неабходна пазначыць асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі Міндоўга, палітычныя манеўры Войшалка.

Па пятаму пытанню падкрэсліце змены ў становішчы ВКЛ пасля смерці Міндоўга пры князях Войшалке, Шварне, Трайдзене.



## 10. Пашырэнне і ўмацаванне ВКЛ у канцы XIII – сярэдзіне XIV ст.

План:

1. Цэнтралізатарскія працэсы ў Польшчы і Маскоўскай дзяржаве ў XIV ст.
2. Шляхі ўключэння беларускіх земляў у склад ВКЛ.
3. Становішча ў Жэмайціі. Войны ВКЛ з крыжакамі.
4. Бітва ў Сіняй Вады. Уключэнне ўкраінскіх земляў у склад ВКЛ.
5. Барацьба ВКЛ за ролю аб'яднальніка ўсіх усходнеславянскіх земляў.

Літаратура:

Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 8, 9. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ермаловіч М. Беларуская дзяржава ВКЛ. Мінск, 2000.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. Мінск, 1994.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Сыны і пасынкі Беларусі. Мінск, 1996.
Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994.
Чаропка В. Імя ў летапісе. Мінск, 1994.
Чаропка В. Уладары Вялікага княства. Мінск, 1996.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню трэба пазначыць узмацненне цэнтралізатарскіх працэсаў у Польшчы і супраціўлене асобных феадалў гэтаму працэсу.

Па другому пытанню – пашырэнне ВКЛ пры Віцене і Гедзіміне, асаблівасці і метады ўключэння асноўных беларускіх земляў у склад ВКЛ.

Па трэцяму пытанню – прычыны складанасцей ВКЛ ў Жмудзі, падзеі барацьбы з агрэсіяй крыжакоў, ролю ў ёй Давыда Гарадзенскага.

Па чацвёртаму пытанню – дзейнасць Альгерда па завяршэнню аб'яднання ў ВКЛ беларускіх земляў, барацьбу Кейстута з крыжакамі.

Па пятаму пытанню пакажыце этапы барацьбы Альгерда з Маскоўскім княствам за ролю аб'яднальніка ўсіх усходнеславянскіх земляў, рысы ВКЛ.

## 11. Унутрыпалітычнае становішча ВКЛ у апошняй трэці XIV – першай пал. XVI ст.

План:

1. Польшча ў еўрапейскай палітыцы XV – першай палове XVI ст.
2. Дынастычная барацьба ў ВКЛ у 70-90-я гг. XIV ст.
3. Унутраная палітыка Вітаўта.
4. Грамадзянская вайна 1432-1436 гг. Дзейнасць Казіміра IV.
5. Паслабленне ўлады вялікага князя ў канцы XV – першай пал. XVI ст.

Літаратура:


Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994.
Всемирная история в 24 томах. Т.9. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ермаловіч М. Беларуская дзяржава ВКЛ. Мінск, 2000.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. Мінск, 1994.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Сыны і пасынкі Беларусі. Мінск, 1996.
Чаропка В. Імя ў летапісе. Мінск, 1994.
Чаропка В. Уладары Вялікага княства. Мінск, 1996.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.


Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню неабходна паказаць унутрыпалітычнае становішча Польшчы, яе адносіны з Заходняй Еўропай і ўплыў на ВКЛ.

Па другому пытанню – прычыны, этапы міжусобнай барацьбы Ягайлы з А.Полацкім, Кейстутам, Вітаўтам, стан каталікоў і праваслаўных.

Па трэцяму пытанню трэба паказаць скасаванне аўтаноміі Полацка і Віцебска, адносіны Вітаўта з каталіцкімі і праваслаўнымі феадаламі.

Па чацвёртаму пытанню падкрэсліце прычыны, асноўныя этапы і вынікі грамадзянскай вайны, выдзеліце персанальныя ўніі ВКЛ з Польшчай.

Па пятаму пытанню – ўплыў знешнепалітычнага і ўнутрыпалітычнага становішча ВКЛ на ролю ў ім сойма, паноў-рады і вялікага князя.



## 12. Знешняя палітыка ВКЛ у апошняй трэці XIV – першай палове XVI ст.

План:

1. Заходняя і ўсходняя цывілізацыі сусвету ў XIV – першай палове XVI ст.
2. Узаемаадносіны ВКЛ з Прусіяй і Лівоніяй у апошняй трэці XIV ст.
3. Войны ВКЛ з крыжакамі ў першай пал. XV ст. Грунвальдская бітва.
4. Барацьба з Крымскім ханствам. М. Глінскі.
5. Саперніцтва ВКЛ з Масквой, уніі з Польшай у 1385 і 1413 гг.

Літаратура:


Всемирная история в 24 томах. ТТ. 9. Минск, 1999, 2000.
Доўнар-Запольскі М. Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Мінск, 1991.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ермаловіч М. Беларуская дзяржава ВКЛ. Мінск, 2000.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. Мінск, 1994.
Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. Мінск, 1992.
Пичета В. Белоруссия и Литва. XV–XVI вв. Москва, 1961.
Сагановіч Г. Айчыну сваю бароначы. Мінск, 1992.
Сыны і пасынкі Беларусі. Мінск, 1996.
Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994.
Чаропка В. Уладары Вялікага княства. Мінск, 1996.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.
Юхо Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 1992.
Юхо Я. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 2000.


Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню трэба паказаць узаемаўплыў цывілізацый праз палітычныя, эканамічныя і культурныя адносіны, ваенныя сутыкненні.

Па другому пытанню вызначце ўмяшальніцтва крыжакоў ва ўзаемаадносіны ВКЛ і Польшы, ва ўнутраныя супярэчнасці ВКЛ.

Па трэцяму пытанню пакажыце ход Вялікай вайны з крыжакамі 1409-1411 гг., падрыхтоўку, правядзенне і вынікі Грунвальдскай бітвы.

Па чацвёртаму пытанню прычыны і вынікі нападаў на ВКЛ крымскіх татар, барацьбу з імі і лёс М. Глінскага.

Па пятаму пытанню – стан ВКЛ пад час войнаў з Масквой пры Александры і Жыгімонце Старым, прадумовы, палажэнні і ролю уній.

## 13. Органы дзяржаўнай улады, кіравання і судовая сістэма ВКЛ

План:

1. Палітычны свет сярэднявечнага грамадства.
2. Фарміраванне саслоўна-прадстаўнічай манархіі ВКЛ.
3. Адміністрацыйны падзел і сістэма мясцовых органаў улады.
4. Развіццё заканадаўчай і судовай сістэмы.
5. Арганізацыя вайсковай справы ВКЛ.

Літаратура

Всемирная история в 24 томах. Т. 9. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Доўнар-Запольскі М. Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Мінск, 1991.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ермаловіч М. Беларуская дзяржава ВКЛ. Мінск, 2000.
Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. Мінск, 1994.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г. Мінск, 1960.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Мінск, 1989.
Эканамічная гісторыя Беларусі. Мінск, 1999.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.
Юхо Я. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 2000.
Юхо Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 1992.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню трэба пазначыць прычыны з"яўлення і этапы развіцця парламентарызму ў Англіі і Францыі, іх уплыў на суседзяў.

Па другому пытанню - прэрагатывы вялікага князя, фарміраванне, ролю сойма і соймікаў, склад і ўплыў на кіраванне паноў-рады.

Па трэцяму пытанню выдзеліце змены ў адміністрацыйным падзеле ВКЛ, акрэсліце адміністрацыйную рэформу Жыгімонта Аўгуста.

Па чацвёртаму пытанню вызначце гісторыю стварэння, зацвярджэння і палажэнні Судзебніка 1468, Літоўскіх статутаў 1529, 1566 і 1588 гг.

Па пятаму пытанню падкрэсліце сістэму фарміравання паспалітага рушэння і ролю наёмнага войска ў ВКЛ.



## 14. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ВКЛ у XIV – першай палове XVI ст.

План:

1. Развіццё сярэднявечнай гаспадаркі ў Еўропе ў XIV– першай палове XVI ст.
2. Сацыяльны склад насельніцтва ВКЛ. Становішча асобных саслоўяў.
3. Формы феадальнага землеўладання. Этапы запрыгоньвання сялян.
4. Станаўленне фальваркава-паншчыннай сістэмы. Аграрная рэформа 1557 г.
5. Развіццё гарадоў, рамяства і гандлю. Магдэбургскае права.

Літаратура:

Всемирная история в 24 томах. Т. 9. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Т. 1. Мінск, 1972.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Доўнар-Запольскі М. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Пичета В. Белоруссия и Литва. XV – XVI вв. Москва, 1961.
Спиридонов М. Закрепощение крестьянства Беларуси. Минск, 1993.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г. Мінск, 1960.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Мінск, 1989.
Эканамічная гісторыя Беларусі. Мінск, 1999.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.
Юхо Я. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 2000.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню – стан земляробства, землеўладання, рамяства і гандлю ў буйнейшых краінах Еўропы, эканамічныя сувязі з ВКЛ.

Па другому пытанню пакажыце асноўныя рысы і палажэнне класаў-саслоўяў – шляхты, мяшчан, сялян і іх узаемаадносіны.

Па трэцяму пытанню – як складвалася сістэма землеўладання, як праходзіла запрыгоньванне сялян, як пашыраліся павіннасці.

Па чацвёртаму пытанню зрабіце вызначэнне фальварка, прычыны станаўлення фальваркава-паншчыннай сістэмы, пункты рэформы 1557 г.

Па пятаму пытанню – рысы Магдэбургскага права, час з'яўлення, гарады, якія яго атрымалі, уплыў на развіццё рамяства і гандлю.

## 15. Фарміраванне беларускай народнасці

План.

1. Фарміраванне народаў у Еўропе і стварэнне нацыянальных дзяржаў.
2. Галоўныя фактары кансалідацыі беларускага этнаса.
3. Этнічная тэрыторыя. Асаблівасці мовы, фальклору і побыту.
4. Роля нацыянальных меншасцей у этнагінезе.
5. Паходжанне назвы «Белая Русь». Самасвядомасць беларусаў.

Літаратура:

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск, 2000.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 6, 7, 8, 9, 10. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Т. 1. Мінск, 1972.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Гринблат М. Белорусы. Минск, 1968.
Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, 1997.
Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мінск, 1995.
Пилипенко М. Возникновение Белоруссии. Минск, 1991.
Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990.
Сокол С. Политическая и правовая мысль Белоруссии. Минск, 1984.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Цітоў В. Этнаграфічная спадчына. Мінск, 1997.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.
Этнаграфія Беларусі. Мінск, 1989.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню пазначце як фарміраваліся асноўныя еўрапейскія народы ў XIII–XVI стст. і ствараласяя іх нацыянальная дзяржаўнасць.

Па другому пытанню выдзеліце палітычныя, сацыяльныя, тэрытарыяльныя фактары фарміравання беларускай народнасці, яе вытокі.

Па трэцяму пытанню выдзеліце межы этнічнай тэрыторыі беларусаў, якія беларусы мелі асаблівасці і рысы мясцовага фальклору, побыту.

Па чацвёртаму пытанню пазначце якія нацыянальныя меншасці, калі і як ўплывалі на ўмовы фарміравання беларускай народнасці.

Па пятаму пытанню – калі і дзе летапісна была пазначана назва «Белая Русь», як яна пашыралася, якія існуюць версіі, як называлі сабе жыхары.



## 16. Рэлігійныя адносіны і царква на беларускіх землях у XIV–XVIII стст.

План:

1. Прычыны, пачатак і ход еўрапейскай рэфармацыі.
2. Змены ў становішчы праваслаўнай царквы на беларускіх землях.
3. Пашырэнне ўплыву каталіцкага касцёлу на беларускіх землях.
4. Рэфармацыйны рух і контррэфармацыя. Дзеячы рэфармацыі.
5. Берасцейская ўнія 1596 г. і развіццё ўніяцкай царквы.

Літаратура:

Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск, 2000.
Блинова Т. Иезуиты в Белоруссии. Минск, 1990.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 9, 10. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Т. 1. Мінск, 1972.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. Мінск, 1992.
Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, 1997.
Мысліцелі і асветнікі Беларусі: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1995.
Сокол С. Политическая и правовая мысль Белоруссии. Минск, 1984.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.
Юхо Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 1992.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню пазначце дзе, калі і як распачаўся рэфармацыйны рух у каталіцтве, хто яго падтрымаў, які зроблены ўплыў на славянаў.

Па другому пытанню высвятліце прычыны і этапы змен у становішчы праваслаў 'я у ВКЛ, уплыў іх на развіццё «рускага пытання».

Па трэцяму пытанню – палітычныя і сацыяльныя ўмовы пашырэння дзейнасці касцёлу, як ён быў звязаны з ВКЛ і асобнымі гаспадарамі.

Па чацвёртаму пытанню пакажыце як распаўсюджвалася рэфармацыя ў ВКЛ, хто дапамагаў ёй, хто і як праводзіў контррэфармацыю.

Па пятаму пытанню – прычыны падтрымкі ідэі ўніі каталікамі і часткой праваслаўных іерархаў, рысы ўніяцкай царквы і этапы яе развіцця.

## 17. Культура беларускіх земляў у XIV–XVI стст.

План:

1. Адраджэнне і гуманізм у Еўропе.
2. Умовы развіцця беларускай культуры. Станаўленне беларускай мовы
3. Дзейнасць М. Гусоўскага, Ф. Скарыны, С. Буднага, В. Цяпінскага.
4. Рысы архітэктуры і выяўленчага мастацтва.
5. Фальклор і традыцыйная культура беларусаў.

Літаратура:


Арлоў У. Таямніцы Полацкай гісторыі. Мінск, 1994.
Архітэктура Беларусі. Мінск. 1993.
Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. Мінск, 2000.
Всемирная история в 24 томах. ТТ. 9, 10. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя беларускага мастацтва ў 6 т. ТТ. 2, 3. Мінск, 1987, 1988.
Коршунов А. Афанасий Филиппович. Минск, 1965.
Каханоўскі Г. Прадвесне навукі. Мінск, 1990.
Лыч Л., Навіцкі У. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск, 1997.
Мысліцелі і асветнікі Беларусі. Мінск, 1995.
Пилипенко М. Возникновение Белоруссии. Минск, 1991.
Скарына і яго эпоха. Мінск, 1990.
Цітоў В. Этнаграфічная спадчына. Мінск, 1997.


Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню трэба паказаць вытокі, час з'яўлення, асноўныя рысы еўрапейскага Адраджэння і ідэалогіі гуманізму, іх уплыў на культуру.

Па другому пытанню – Адраджэнне на беларускіх землях, фактары развіцця культуры, умовы існавання і роля беларускай мовы ў ВКЛ.

Па трэцяму пытанню вызначце пачатак беларускага кнігадрукавання, яго перанос ў ВКЛ, складанасці і поспехі ў дзейнасці кнігадрукароў.

Па чацвёртаму пытанню выдзеліце стылі, рысы мастацкіх і дойлідскіх школ, іх найбольш характэрныя прыклады, пазначце і ўплыў царквы.

Па пятаму пытанню асвятліце найбольш характэрныя рысы матэрыяльнай і духоўнай народнай культуры, яе уплыў на сучаснасць.



## 18. Утварэнне і дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай

План:

1. Еўропа ў часы Нідэрландскай рэвалюцыі 1566–1609 гг.
2. Лівонская вайна. Абставіны ўтварэння Рэчы Паспалітай.
3. Значэнне Люблінскай уніі. III Статут ВКЛ.
4. Абмежаванне ўлады караля Рэчы Паспалітай. «Генрыхавы артыкулы».
5. Акаталічванне беларускай шляхты, «залатыя шляхецкія вольнасці».

Літаратура:


Всемирная история в 24 томах. ТТ. 11, 12. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Т. 1. Мінск, 1972.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Доўнар-Запольскі М. Гісторыя Беларусі. Мінск, 1994.
Ермаловіч М. Беларуская дзяржава ВКЛ. Мінск, 2000.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Саверчанка І. Канцлер Вялікага княства. Мінск, 1992.
Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Мінск, 1989.
Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994.
Ткачоў М. Замкі і людзі. Мінск, 1991.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.
Юхо І. Крыніцы беларуска-літоўскага права. Мінск, 1991.
Юхо Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 1992.


Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню пазначце рэлігійныя войны, якія адбываліся ў Еўропе ў другой палове XVI ст. і ўплыў іх на лёс Усходняй Еўропы.

Па другому пытанню выдзеліце прычыны, рух, становішча ваюючых бакоў пад час вайны, яе ўплыў на палітыку Польшчы і Люблінскі сойм.

Па трэцяму пытанню – ўмовы Люблінскай уніі 1569 г., палажэнні уніі, супраць якіх выступала ВКЛ, распрацоўку і значэнне III Статута.

Па чацвёртаму пытанню высветліце прычыны абмежавання ўлады караля РП, палажэнні «генрыхавых артыкулаў», барацьбу магнатаў.

Па пятаму пытанню - прычыны акаталічвання шляхты, вынікі гэтага працэсу, уплыў на гісторыю княства, як пашырыліся правы шляхты.

## 19. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у апошняй трэці XVI – другой трэці XVII ст.

План:

1. Еўропа ў часы Трыццацігадовай вайны (1618–1648 гг.)
2. Удзел Ілжэдзмітрыя I, Ілжэдзмітрыя II у рускай смуце пач. XVII ст.
3. Войны Расіі і Рэчы Паспалітай у 1609–1618 і 1632–1634 гг.
4. Антыфеадальная вайна 1648–1651 гг. на беларускіх землях.
5. Вайна Рэчы Паспалітай з Расіяй у 1654–1667 гг. Вынікі войнаў.

Літаратура:

Всемирная история в 24 томах. ТТ. 11, 12, 13. Минск, 1999, 2000.
Гісторыя Беларускай ССР у 5 т. Т. 1. Мінск, 1972.
Гісторыя Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1998, 2000.
Ігнатоўскі У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мінск, 1992.
Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. Мінск, 1992.
Нарысы гісторыі Беларусі ў 2 ч. Ч. 1. Мінск, 1994.
Саверчанка I. Канцлер Вялікага княства. Мінск, 1992.
Тарасаў К. Памяць пра легенды. Мінск, 1994.
Ткачоў М. Замкі і людзі. Мінск, 1991.
Чарняўскі М. Правадыр крылатых вершнікаў. Мінск, 1998.
Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. ТТ. 1, 2, 3, 4, 5, 6. Ч. 1. Мінск, 1992-2001.
Юхо Я. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Мінск, 1992.

Рэкамендацыі па выкананні работы:

Па першаму пытанню – сутыкненне каталіцкай і антыкаталіцкай кааліцый у Еўропе пад час Трыццацігадовай вайны і яе вынікі.

